# Людзі, галубы, любоў

У Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры 30 красавіка чакаецца чарговая прэм'ера — "Прыпынак". Але ж новыя спектаклі ставяцца тут без перапынку: яшчэ пару тыдняў таму ў афішы ўзнікла назва "Любоў і галубы", вядомая па аднайменнай кінастужцы.







## СМЕШНА ЦІ СТРАШНА?

Знаны расійскі рэжысёр Сяргей Фядотаў, заснавальнік і нязменны кіраўнік Пермскага тэатра "Ля Моста", паклаў у аснову сваёй лірычнай камедыі не кінасцэнарый, а п'есу Уладзіміра Гуркіна, па якой тая стужка здымалася. Таму ў параўнанні з фільмам, што стаў савецкай класікай 1980-х, ёсць некаторыя адрозненні. Але ж уздзеянне эстэтыкі кінамастацтва адчуваецца ў сцэнаграфіі Ільі Падкапаева, касцюмах Кацярыны Герасіменка, выкананых у строгай адпаведнасці з пастаноўчай задумай. Уласцівае рэжысёру імкненне да гэткага "містычнага рэалізму" выявілася тут у стварэнні тэатральнага гіперрэалізму, калі сцэнічная прастора нагадвае адмыслова пабудаваны кінапавільён ці ўвогуле частку рэальнага вясковага побыту. Нават галубы сапраўдныя — жывыя, глядзяць праз сетку на артыстаў, гледачоў, сочаць за дзеяй. І ў выніку з гэткага забаўляльнага дадатку, уласцівага оперна-балетным "імператарскім" пастаноўкам, ператвараюцца ў неад'емны сімвал аповеду. Буркаванне галубоў не толькі стварае фанічны эфект атмасфернасці, але і выклікае паралелі-параўнанні між птушкамі і людзьмі. Праз гэта вядомая гісторыя сыходу мужа да іншай жанчыны, пакутаў жонкі, а потым вяртання яго ў сям'ю ўспрымаецца па-новаму, з іншага ракурсу.

Раптам становіцца не смешна, а страшна: галубы — любяць, разумеюць адно аднаго, падтрымліваюць і саміх сябе, і людзей. А што людзі? Лаюцца, кідаюцца на блізкіх то з кулакамі, а то і з сякерай. Пры гэтым старанна пераконваюць нас, што імі рушаць каханне ды любоў. Можа, так яно і ёсць? Менавіта па-руску: мауляў, б'е, крычыць, не жадае выслухаць (толькі не муж тут, а жонка) — значыць, кахае. Спектакль працягвае шматлікія як класічныя творы, так і сучасныя меладрамы пра непаразуменне між блізкімі і роднымі. Замест таго каб цывілізавана вырашыць канфлікт (а лепей — увогуле да яго не даводзіць, сцішваючы ўжо на першых парастках-хвалях), героі горача выпускаюць пару, а праз які час кідаюцца ў полымя па новыя вугольчыкі, абпальваючы свае душы.

## НЕ ТОЛЬКІ КАХАННЕ

Першае сямейнае сутыкненне, з якога і пачынаецца спектакль, — карціна звыклай савецкай рэчаіснасці, калі прыдбанне пары галубоў робіць непапраўную дзірку ў бюджэце. І сведчанне таго, што празаічна-практычнае, у некаторай ступені нават утылітарнае стаўленне да жыцця, уласцівае Надзі (Віялета Сарвірава), успрымалася куды больш мэтазгодным, чым уласна эстэтычнае, да якога ў поўнай меры схільная хіба малодшая дачка, школьніца Вольга (нядаўняя выпускніца БДУКМ Яна Шынкарова). Нават для Васі Кузякіна (Дзяніс Маісейчык) галубы — найперш памяць пра сябра, а ўжо потым — захапленне гармоніяй прыроды.



Сямейныя сваркі больш старэйшых суседзяў — Шуры (непераўзыдзеная Наталля Анішчанка) і Міці Віслухіна (Аляксандр Шароў) — адлюстраванне сітуацыі непераможнага п'янства, якім у мінулыя дзесяцігоддзі было прынята нават бравіраваць.

Даведаўшыся пра палюбоўніцу, Надзя некалькі дзён ляжыць пластом, што павінна выклікаць спачуванне гледачоў. А насамрэч гэта дэманстрацыя эгацэнтрызму. Бо за сваімі пакутамі гераіня не зважае на праблемы старэйшай дачкі Люды (Дар'я Ізмайлава), якая сышла ад мужа. Пры сваім далейшым шчасці, памірыўшыся з Васем, практычна не цікавіцца жыццём сына Лёнькі (студэнт Акадэміі мастацтваў Дзмітрый Стасюк), што днямі сыходзіць у армію. Само ж прымірэнне, якое героі хаваюць не толькі ад вяскоўцаў, але і ад сваіх дзяцей, узнімае яшчэ адну важную праблему: суіснавання прыватнага чалавечага жыцця — і грамадскай думкі, падпарадкаванне якой здольнае парушыць сямейны мір, дасягнуты "не па правілах".

Узнята ў спектаклі і тэма адзіноты. Бо Раіса Захараўна (Наталля Дуванава), з якой Вася знаёміцца на курорце, не ракавая разлучніца, а пяшчотная, ды даведзеная да адчаю жанчына, якой няма да каго прытуліцца, няма каму выказаць усю сваю прагу любові. Невыпадкова і сустрэча на лаўцы пад ліхтаром, і само курортнае наваколле намаляваны максімальна абагульнена, пункцірам — як нейкая мроя, а не рэальнасць. Таму ўся ўвага і ў гэтай сцэне, і пазней у Раісы дома скіравана выключна на герояў і іх гіпертрафіраваныя пачуцці, пад якімі насамрэч няма рэальнай глебы: проста "сустрэліся дзве адзіноты".





## АКЦЁРСКІ МАЙСТАР-КЛАС

Спектакль у поўнай меры можна назваць акцёрскім, ён вабіць добра распрацаванымі ролямі. У п'есе дакладна прапісаны ўзрост герояў. Але многія артысты значна маладзейшыя за сваіх персанажаў. Падлеткі, у сваю чаргу, пададзены болей дарослымі — не па выглядзе, а па ўнутранай асэнсаванасці дзеянняў. І гэта цалкам адпавядае сучаснасці, калі дзеці сталеюць больш хутка, чым іх равеснікі паўстагоддзя таму. Дарослыя ж, наадварот, даўжэй захоўваюць маладосць.

У акцёрскай ігры шмат псіхалагічна дакладных дэталяў, якія паглыбляюць прадстаўленыя вобразы. Асабліва гэта тычыцца любоўнага трыкутніка. Вася яшчэ не паспеў ад'ехаць, а ў яго ўжо сум па доме. Ён хоча пацалаваць сваю жонку, а тая высмейвае ягоны парыў. Таму ён і будзе гэтак расчулены, калі ўбачыць рамантыку ў Раісе. Спачатку ён цураецца жанчыны, аднекваецца на ўсе яе прапановы. Але далейшая хвала пачуццяў змятае ўсе забароны. І ўвесь спектакль атрымліваецца пра трывалае каханне і хуткі палёт. Не столькі галубоў, колькі эмоцый. І тых, і тых трэба адпускаць — каб яны вярнуліся.

**Надзея БУНЦЭВІЧ**

Фота Уладзіміра ШЛАПАКА